УДК 930+94(476)«1985/1991»

**Я. І. Завацкі**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

# ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАЛІТЫКА ПА АХОВЕ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ І ПРЫРОДАКАРЫСТАННІ Ў БССР (1985–1991 ГГ.): ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПЫТАННЯ

Тэма дзяржаўнай экалагічнай палітыкі ў БССР у гады гарбачоўскай перабудовы з'яўляецца наватарскай у гістарычнай навуцы на сённяшні дзень. Апошняе комплекснае даследаванне, прысвечанае дзяржаўнай палітыцы ў рэспубліцы ў сферы аховы навакольнага асяроддзя і прыродакарыстання, выйшла ў свет у 1987 г. Аднак яго храналагічныя рамкі ахопліваюць перыяд з 1976 па 1985 гг., у сувязі з чым працэсы перабудовы амаль не закранутыя. Асобныя пытанні разглядаемай палітыкі сталі прадметам даследавання спецыялістаў іншых навуковых галін, перш за ўсё юрыстаў і эканамістаў. Яны звяртаюць увагу на складанасці ў функцыянаванні сістэмы кіравання па ахове навакольнага асяроддзя, хібы ў экалагічным заканадаўстве і праблемы рэфармавання эканамічнага рэгулявання прыродакарыстаннем. У даследаваннях навукоўцаў-прыродазнаўцаў закранаюцца экалагічныя праблемы, звязаныя з негатыўным уздзеяннем прамысловасці і меліярацыйных работ на стан навакольнага асяроддзя, у сувязі з чым прыводзяцца захады з боку дзяржавы па пераадоленні наяўных прагалаў. З мэтай сістэмнага аналізу дзяржаўнай экалагічнай палітыкі ў рэспубліцы ў гады перабудовы патрабуецца даследаванне рашэнняў КПСС – КПБ, дзейнасці Дзяржкамітэта БССР па ахове прыроды, Беларускага рэспубліканскага ўпраўлення па гідраметэаралогіі і кантролі прыроднага асяроддзя і Пастаяннай камісіі Вярхоўнага Савета БССР па ахове прыроды і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў.

**Ключавыя словы:** гістарыяграфія, экалагічная палітыка, БССР, перабудова.

**Для цытавання:** Завацкі Я. І. Дзяржаўная палітыка па ахове навакольнага асяроддзя і прыродакарыстанні ў БССР (1985–1991 гг.): гістарыяграфія пытання // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2021. № 2 (251). С. 58–63.

**Ya. I. Zavatski**
Belarusian State University

# STATE POLICY ON ENVIRONMENTAL PROTECTION AND NATURE MANAGEMENT IN THE BSSR (1985–1991): HISTORIOGRAPHY OF THE ISSUE

The topic of state environmental policy in the BSSR during the years of Gorbachev's perestroika is innovative in historical science today. The last comprehensive study on the state policy in the republic in the field of environmental protection and nature management was published in 1987. However, its chronological framework covers the period from 1976 to 1985, and therefore the processes of perestroika are almost not affected. Some issues of the policy under consideration have become the subject of research by specialists in other scientific fields, primarily lawyers and economists. They draw attention to the difficulties in the functioning of the environmental management system, omissions in environmental legislation and the problems of reforming the economic regulation of environmental management. In the studies of natural scientists environmental problems related to the negative impact of industry and land reclamation work on the state of the environment are touched upon, in connection with which measures are taken by the state to overcome the existing gaps. In order to systematically analyze the state environmental policy in the republic during the years of perestroika, it is necessary to study the decisions of the CPSU – CPB, the activities of the State committee of the BSSR for nature protection, the Belarusian republican department for hydrometeorology and environmental control and the Standing commission of the Supreme Council of the BSSR on nature protection and rational use of natural resources.

**Keywords:** historiography, environmental policy, the BSSR, Perestroika.

**For citation:** Zavatski Ya. I. State policy on environmental protection and nature management in the BSSR (1985–1991): historiography of the issue. *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy,* 2021, no. 2 (251), pp. 58–63 (In Belarusian).

**Уводзіны.** Адметнасцю вывучэння пытання дзяржаўнай экалагічнай палітыкі ў БССР на мяжы 1980–1990-х гг. з'яўляецца адсутнасць на сённяшні дзень у беларускай гістарыяграфіі комплексных навуковых працаў па дадзенай праблеме. Асобныя аспекты разглядаемай

палітыкі сталі прадметам даследавання перш за ўсё сярод прыродазнаўцаў, юрыстаў і эканамістаў.

**Асноўная частка.** Апошняя спроба сістэмнага гістарычнага аналізу дзяржаўнай прыродаахоўнай палітыкі ў БССР належыць М. Даўгяле, на падставе чаго ў 1987 г. ім была абаронена кандыдацкая дысертацыя. У сваім даследаванні навуковец закранае мерапрыемствы па ахове прыроды падчас ажыццяўлення X і XI пяцігадовых планаў (1976–1985 гг.), і ў рамках гэтага адзначае станоўчую ролю Камуністычнай партыі Беларусі па ўцягванні ў гаспадарчы зварот прамысловых і бытавых адходаў, беражлівым выкарыстанні і ахове водных рэсурсаў, ажыццяўленні меліярацыйных работ [1, с. 14, 16]. Разам з тым даследчык адзначае, што ў правядзенні меліярацыі ў разглядаемы перыяд не ўдалося дабіцца карэннага пералому [1, с. 16].

На сучасным этапе прававы аспект аховы навакольнага асяроддзя ў БССР у гады гарбачоўскай перабудовы знайшоў адлюстраванне ў працах С. Балашэнкі і Н. Мінько [2, 3, 4]. Пытанні дзяржаўнага кіравання ў сферы аховы прыроды ў Рэспубліцы Беларусь закранаюцца ў манаграфіі С. Балашэнкі, у межах чаго ім даследуецца працэс станаўлення рэспубліканскай сістэмы кіравання па ахове навакольнага асяроддзя. Адносна перыяду канца 1980-х – пачатку 1990-х гг. навуковец адзначае, што ў БССР на той час прыродаахоўнае кіраванне мела складаную арганізацыйную структуру, якая грунтавалася на сістэме выканаўча-распарадчых органаў. Па гэтай прычыне ўсе рэформы ў кіраванні былі непарыўна звязаныя са зменамі адзначаных органаў. Апроч за тое, ён падкрэслівае, што адсутнічаў адзіны орган, які адказваў за функцыю вырашэння першасных задач па ахове прыроды [2, с. 25–26]. У цэлым, на думку навукоўца, падчас гарбачоўскай перабудовы значная частка рэформ у сістэме прыродаахоўнага кіравання аказаліся няўдалымі [2, с. 28].

Пытанням канстытуцыйна-прававога рэгулявання ў вобласці рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў прысвечаныя артыкулы Н. Мінько. Беручы пад увагу час дзеяння канкрэтнага Асноўнага Закона рэспублікі, даследчыца вылучае пяць перыядаў канстытуцыйна-прававога рэгулявання прыродакарыстання ў Беларусі. Згодна з ёй, чацвёрты і пяты перыяды ахопліваюць адпаведна рамкі з 1977–1978 па 1990–1994 гг. і з 1990–1994 гг. па сённяшні дзень [3, с. 77]. У якасці водападзелу паміж адзначанымі перыядамі Н. Мінько ставіць Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР ад 27 ліпеня 1990 г., якая садзейнічала распрацоўцы і прыняццю некалькіх законаў па дзяржаўным рэгуляванні прыродакарыстання [4, с. 38].

Экалагічнае заканадаўства і прыродаахоўная палітыка ў БССР на мяжы 1980-х і 1990-х гг. сталі прадметам даследавання ў шэрагу айчынных навучальных дапаможнікаў па юрыспрудэнцыі, якія выйшлі ў свет у 1991–1992 гг. Сістэмнай у гэтых адносінах прац з'яўляецца кніга А. Бабылёва і С. Балашэнкі «Пытанні агульнай тэорыі экалагічнага права». Яе аўтары адзначаюць, што гісторыя развіцця савецкага грамадства грунтавалася на канцэпцыі дамінавання эканамічных інтарэсаў над экалагічнымі. Дадзеная канцэпцыя праяўлялася ў чатырох фактарах. Па-першае, у значным адставанні тэмпаў узнаўлення прыродных рэсурсаў над тэмпамі іх выкарыстання. Па-другое, у вызначальнай перавазе развіцця навукі і тэхнікі над ажыццяўленнем прыродаахоўных захадаў. Па-трэцяе, у палітычным прыярытэце праграм, звязаных з ростам спажывання прыродных рэсурсаў. Па-чацвёртае, у грэбаванні экалагічнай бяспекі людзей, што праявілася ў змаганні з вынікамі аварыі на Чарнобыльскай АЭС. А. Бабылёў і С. Балашэнка падкрэсліваюць, што падчас перабудовы правільнае спалучэнне эканамічных інтарэсаў і экалагічнай бяспекі грамадства не ўлічвалася пры ажыццяўленні мерапрыемстваў па пераходзе краіны да рынкавай эканомікі [5, с. 5–7]. На думку даследчыкаў, прыродаахоўная дзейнасць савецкай дзяржавы на той момант не забяспечвала яе грамадзянам экалагічнай бяспекі. Па гэтай прычыне аўтары кнігі прапаноўваюць замацаваць у Канстытуцыі БССР самастойнае права грамадзян на спрыяльнае навакольнае асяроддзе, якое гарантавалася б судовым парадкам [5, с. 7, 64].

У другім навучальным дапаможніку пад рэдакцыяй А. Бабылёва – «Прававы рэжым выкарыстання і аховы прыродных аб'ектаў і прыродных рэсурсаў» – робіцца аналіз рэспубліканскага прыродаахоўнага заканадаўства, у рамках чаго адзначаюцца ў тым ліку яго прагалы. У прыватнасці, паводле арт. 6 Кодэкса БССР аб зямлі ад 11 снежня 1990 г. рашэнні Саветаў народных дэпутатаў, якія былі звязаны з адабраннем і прадастаўленнем земляў для несельскагаспадарчых патрэб, калектыўнага садаводства і агародніцтва, прымаліся з улікам грамадскага меркавання. Аднак у артыкуле не быў замацаваны механізм адзначанага грамадскага меркавання, што дазваляла мясцовым Саветам дэманстраваць ігнараванне: «Грамадскае меркаванне не падтрымлівае», «народ нас не зразумее» і г. д. [6, с. 29]

Разнастайныя пытанні эканомікі прыродакарыстання ў БССР на мяжы 1980–1990-х гг. аналізуюцца ў спецыяльным зборніку навуковых прац «Эколага-эканамічныя праблемы ў Беларусі і шляхі іх вырашэння», падрыхтаваным

Навукова-даследчым эканамічным інстытутам Дзяржэканамплана БССР у 1991 г. Разгляд гэтых пытанняў на дзяржаўным узроўні даследуецца ў артыкулах С. Качаноўскага, В. Шымавай і П. Барташа. Праблема захавання экалагічнай бяспекі ва ўмовах пераходу БССР да рынкавай эканомікі закранаецца ў артыкуле С. Качаноўскага. Навуковец адзначае наступныя прычыны, якія прывялі да катастрафічнага становішча навакольнага асяроддзя ў СССР: памылковыя ўяўленні аб заканамернасцях ва ўзаемадзеянні прыроды і грамадства; ілюзія бязмежнага панавання сацыялістычнай дзяржавы над прыроднымі багаццямі; знішчэнне векавых традыцый; грэбаванне ўласным народам, яго культурай і асяроддзем пражывання; прыход да кіраўніцтва малакампетэнтных людзей, не здольных разважаць доўгатэрміновымі катэгорыямі. Даследчык бачыць карэннае паляпшэнне экалагічнай абстаноўкі ў рэспубліцы ў паспяховым ажыццяўленні эканамічнай рэформы. На яго меркаванне, важнейшай перадумовай у справе аховы прыроды павінна стаць падрыхтоўка нарматыўна-прававога, эканамічнага і сацыяльна-палітычнага механізмаў экалагічнага кіравання [7, с. 5–7].

Пытанне рэфармавання савецкага гаспадарчага механізму ва ўмовах пераходу да рынкавай эканомікі прааналізавала В. Шымава ў артыкуле «Некаторыя аспекты ўдасканалення гаспадарчага механізму прыродакарыстання ва ўмовах пераходу да рынку». У прыватнасці, яна сцвярджае, што агульнанародная ўласнасць на прыродныя рэсурсы, абвешчаная ў Канстытуцыі СССР 1977 г., насамрэч была падменена на дзяржаўную ў асобе канкрэтных міністэрстваў і ведамстваў. У выніку гэта прывяло да мноства згубных наступстваў. Выйсце са складанай сітуацыі яна бачыць у пераходзе ад фактычна ведамаснай уласнасці на прыродныя рэсурсы да агульнанароднай у асобе мясцовых органаў улады, якія павінны несці поўную грамадскую адказнасць за стан навакольнага асяроддзя [8, с. 16].

На хібы ў рэфармаванні дзяржаўнага экалагічнага кіравання ў БССР звяртае ўвагу П. Барташ. У артыкуле «Некаторыя праблемы перабудовы дзяржаўнага экалагічнага кіравання ў рэспубліцы» ён адзначае, што шматлікім прыродаахоўным структурам уласцівыя паралелізм і дубляванне па ажыццяўленні гэтага кіравання. Апроч за тое, кіраўнічая дзейнасць Дзяржкампрыроды БССР носіць выбарачны характар: ёй, галоўным чынам, нададзеныя правы па ахове водных рэсурсаў [9, с. 103].

Эканамічныя супярэчнасці прыродакарыстання ва ўмовах пераходу да рынкавай эканомікі сталі прадметам даследавання ў аднайменнай кандыдацкай дысертацыі В. Пацехінай. У дадзеным рэчышчы асноўнай супярэчнасцю даследчыца бачыць разыходжанне паміж грамадскім характарам прыродных багаццяў і ўскосным іх прысваеннем эканамічна адасобленымі гаспадарчымі суб'ектамі [10, с. 10]. Вырашэнне экалагічнага крызісу В. Пацехіна разглядае праз стварэнне новага прыродагаспадарчага механізму. На яе погляд, умовамі яго стварэння павінны стаць пераадоленне састарэлых форм гаспадарчай дзейнасці і іх носьбітаў; забеспячэнне ўзгодненасці і сумяшчальнасці рынкавых і планавых метадаў гаспадарання; змяненне адносін уласнасці на прыродна-рэсурсны патэнцыял і тэхнагенныя сродкі вытворчасці [10, с. 12–13].

Экалагічны аспект аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага прыродакарыстання ў БССР напачатку перабудовачных працэсаў стаў прадметам даследавання ў манаграфіях С. Валянцея, В. Парфёнава і А. Лучкова [11, 12]. С. Валянцей адзначае, што на мяжы 1970–1980-х гг. у СССР адсутнічала надведамная сістэма кіравання па ахове навакольнага асяроддзя (на той час разглядаемай дзейнасцю займаліся 14 арганізацый). Адмоўным следствам гэтага стала недасканалае выкарыстанне тэхнічных сродкаў аховы прыроды, раззасяроджаных практычна па ўсіх галінах эканомікі, якія ў той ці іншай меры забруджвалі навакольнае асяроддзе. Да таго ж даследчык звяртае ўвагу на той факт, што сістэма падрыхтоўкі спецыялістаў у сферы экалогіі патрабавала ўдасканалення [11, с. 29–30]. Рашэнні, прынятыя на XXVII з'ездзе КПСС (23 лютага – 3 сакавіка 1986 г.), ён разглядае як карэнную змену курса ў вобласці эколага-эканамічнай стратэгіі савецкага грамадства [11, с. 27]. У пытанні глабальнага вырашэння праблемы аховы навакольнага асяроддзя С. Валянцей вылучае два накірункі: «гарманічнае развіццё адносін паміж грамадствам і прыродай і фармаванне рэсурсазберагальнай вытворчасці» [11, с. 32].

В. Парфёнаў і А. Лучкоў сцвярджаюць, што напружаная экалагічная сітуацыя ў шэрагу беларускіх гарадоў напрыканцы існавання СССР была часткова абумоўлена эканамічнымі прычынамі. Яны разглядаюць аптымізацыю прыродакарыстання праз прызму адпаведнасці эканамічнага механізму прававым нормам. У гэтай сувязі аўтары манаграфіі выступаюць за ўдасканаленне прыродаахоўных законаў, прымяненне штрафных санкцый за парушэнне экалагічных патрабаванняў і нарматываў, а таксама за паляпшэнне экалагічнай адукацыі і выхавання насельніцтва і, перш за ўсё, падрыхтоўку кваліфікаваных спецыялістаў-эколагаў [12, с. 3–4, 44].

Пытанням аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага прыродакарыстання ў БССР у гады перабудовы прысвечаны канспект лекцый Л. Машаравай, А. Бацвінневай і С. Канстанціновіча.

Асаблівую цікавасць прадстаўляе раздзел канспекта, дзе закранаецца пытанне абароны ад забруджвання водных рэсурсаў рэспублікі, у першую чаргу возера Нарач. На думку аўтараў, гаротнае становішча возера з'яўляецца пераканаўчым сведчаннем таго, што экалагічная культура савецкага народа знаходзіцца не на належным узроўні [13, с. 38]. Напрыканцы раздзела кнігі навукоўцы падкрэсліваюць: «Зараз мы ўкладваем у ахову прыроды каля аднаго адсотку нацыянальнага даходу. Даказана, што выкарыстанне трох адсоткаў нацыянальнага даходу стабілізуе прыроднае асяроддзе, пяці адсоткаў – паляпшае, калі не пераступіць небяспечную рысу, за якой узнікаюць незваротныя з'явы. Тады і дзесяці працэнтаў не хопіць» [13, с. 41].

Меліярацыі Беларускага Палесся прысвечаная аднайменная манаграфія М. Аўраменкі. Навуковец адзначае, што комплексная меліярацыя 1960–1980-х гг. змяніла ў лепшы бок палескі рэгіён у сацыяльных і эканамічных адносінах [14, с. 41]. Выпадкі ж парушэння прыродакарыстання, такія як распашка водаахоўных палос, пераасушэнне торфу і інш., ён разглядае толькі як прагалы, якія частка землекарыстальнікаў дапускае пры правядзенні меліярацыі. Тым не менш пры пераадоленні адзначаных недахопаў асушальная сістэма з'яўляецца экалагічна надзейнай. У цэлым масавы вывад асушаных зямель з сельскагаспадарчага звароту М. Аўраменка лічыць непрымальным [14, с. 156]. «Без меліярацыі зямель у Палессі немагчыма не толькі весці сельскую гаспадарку, але і палепшыць жыццё насельніцтва», – падсумоўвае ён [14, с. 156].

Экалагічныя праблемы СССР на мяжы 1980–1990-х гг. даследаваў амерыканскі палітолаг Д. Дж. Пітэрсан у манаграфіі «Праблемныя землі: спадчына савецкага разбурэння навакольнага асяроддзя». Адносна Беларусі навуковец прыводзіць статыстычныя даныя па атмасферным, водным і зямельным забруджванні ў савецкім кантэксце. Найбольш глыбока прыклад Беларусі ўзгадваецца ім пры вывучэнні хібаў экономікі прыродакарыстання ў Савецкім Саюзе. Так, на той час кіраўнікі прадпрыемстваў надавалі мала ўвагі ахове навакольнага асяроддзя, паколькі наступствы невыканання плана былі больш сур'ёзнымі, чым наступствы парушэння экалагічных правілаў. Таму кіраўнікі не былі схільнымі спыняць вытворчасць дзеля барацьбы з забруджваннем [15, с. 68]. У дадзеным рэчышчы Д. Дж. Пітэрсан узгадвае адкрыты ліст работнікаў вытворчага аб'яднання «Хімвалакно» г. Светлагорска да сваіх таварышаў з Асацыяцыі хімічнай вытворчасці г. Славянска Данецкай вобласці, які быў надрукаваны ў «Праўдзе Украіны» ў студзені 1990 г. У лісце работнікі «Хімвалакна» адзначылі, што іх прадпрыемства атрымала са Славянска толькі трэць запланаванай колькасці кальцынíраванай соды для ачысткі сцёкавых вод, таму яны былі вымушаны скідваць неачышчаныя прамысловыя сцёкі ў р. Бярэзіну. У выніку працоўны калектыў «Хімвалакна» панёс штраф у памеры 89 тыс. рублёў за атручванне рыбы [15, с. 69–70].

**Заключэнне.** Праблема дзяржаўнай экалагічнай палітыкі ў БССР на мяжы 1980–1990-х гг. у сённяшняй гістарычнай навуцы амаль не закранутая. Асобныя аспекты гэтай праблемы даследаваліся іншымі навукоўцамі, у першую чаргу юрыстамі і эканамістамі. Аналізуючы дзяржаўныя захады па ахове прыроды, яны акцэнтуюць увагу галоўным чынам на адпаведнасці заканадаўства экалагічным нормам і эканамічнай палітыкі на стан навакольнага асяроддзя. Пры вывучэнні прыродаахоўнай праблематыкі сучаснымі гісторыкамі працы адзначаных навукоўцаў уяўляюць карысць у сэнсе даследавання савецкай нарматыўна-прававой базы і функцыянавання дзяржаўнага кіравання па ахове прыроды. Тым не менш патрэбна звярнуць увагу на тое, што юрыстамі і эканамістамі не былі сістэмна прааналізаваны рашэнні XXVII і XXVIII з'ездаў КПСС, XIX Усесаюзнай канферэнцыі КПСС, XXX і XXXI з'ездаў КПБ і іх уплыў на трансфармацыю заканадаўства і эканамічнага кіравання ў справе аховы прыроды.

Акрамя даследавання ўплыву партыйных з'ездаў на экалагічную палітыку ў БССР, у гістарычнай навуцы патрабуецца вывучэнне дзейнасці дзяржаўных органаў, якія неслі адказнасць за ахову навакольнага асяроддзя і прыродакарыстанне. У выпадку БССР разглядаемая праблема тычыцца дзейнасці Дзяржкамітэта БССР па ахове прыроды, Беларускага рэспубліканскага ўпраўлення па гідраметэаралогіі і кантролі прыроднага асяроддзя і Пастаяннай камісіі Вярхоўнага Савета БССР па ахове прыроды і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў.

## Спіс літаратуры


1. Довгялло М. С. Деятельность Компартии Белоруссии по организации охраны и рациональному использованию природных ресурсов (1976–1985 гг.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.01. Минск: БГУ им. В. И. Ленина, 1987. 22 с.

2. Балашенко С. А. Государственное управление в области охраны окружающей среды. Минск: БГУ, 2000. 341 с.

3. Мінько Н. С. Канстытуцыйна-прававое рэгуляванне ў сферы прыродакарыстання ў БССР і Рэспубліцы Беларусь: станаўленне і развіццё // Сацыяльна-эканамічныя і прававыя даследаванні. 2009. № 4. С. 75–86.

4. Мінько Н. С. Канстытуцыйна-прававое рэгуляванне ў сферы прыродакарыстання ў БССР і Рэспубліцы Беларусь // Беларускі гістарычны часопіс. 2009. № 12. С. 36–39.

5. Бобылев А. И., Балашенко С. А. Вопросы общей теории экологического права. Минск: БГУ, 1991. 123 с.

6. Бобылев А. И., Демичев Д. М., Шингель Н. А. Правовой режим использования и охраны природных объектов и природных ресурсов: экологическое право: особенная часть: учеб. пособие. Минск: БГУ, 1992. 198 с.

7. Кочановский С. Б. Охрана природной среды и экологическая безопасность в условиях перехода республики к рыночной экономике // Эколого-экономические проблемы в Белоруссии и пути их решения: сб. науч. тр. Минск: НИЭИ Госэкономплана БССР, 1991. С. 5–12.

8. Шимова О. С. Некоторые аспекты совершенствования хозяйственного механизма природопользования в условиях перехода к рынку // Эколого-экономические проблемы в Белоруссии и пути их решения: сб. науч. тр. Минск: НИЭИ Госэкономплана БССР, 1991. С. 12–20.

9. Бартош П. Н. Некоторые проблемы перестройки государственного экологического управления в республике // Эколого-экономические проблемы в Белоруссии и пути их решения: сб. науч. тр. Минск: НИЭИ Госэкономплана БССР, 1991. С. 103.

10. Потехина О. Я. Экономические противоречия природопользования: автореф. дис. ... канд. экон. наук: 08.00.01. Минск: БГУ, 1993. 19 с.

11. Валентей С. Д. Совершенствование региональной системы рационального природопользования и охраны окружающей среды. Минск: БелНИИНТИ, 1986. 92 с.

12. Парфенов В. И., Лучков А. И. Современные подходы к решению экологических проблем в Белоруссии. Минск: БелНИИНТИ, 1991. 47 с.

13. Машарова Л. П., Ботвиньева А. М., Константинович С. А. Охрана окружающей среды и природопользование. Минск: РМ ИПК, 1989. 57 с.

14. Авраменко Н. М. Мелиорация Белорусского Полесья. Минск: Беларуская навука, 2017. 165 с.

15. Peterson D. J. Troubled lands: the legacy of Soviet environmental destruction. Boulder, San Francisco, Oxford: Westview Press, 1993. 276 p.

## References

1. Dovgyallo M. S. *Deyatel'nost' Kompartii Belorussii po organizatsii okhrany i ratsional'nomu ispol'zovaniyu prirodnykh resursov (1976–1985 gg.): avtoref. dis. ... kand. ist. nauk* [Activities of the Communist Party of Belarus on the organization of protection and rational use of natural resources (1976–1985). Abstract of thesis PhD (Historical science)]. Minsk, 1987. 22 p.

2. Balashenko S. A. *Gosudarstvennoe upravlenie v oblasti okhrany okruzhayushchej sredy* [State administration in the field of environmental protection]. Minsk, BGU Publ., 2000. 341 p.

3. Min'ko N. S. Constitutional and legal regulation in the sphere of nature management in the BSSR and the Republic of Belarus: formation and development. *Satsyyal'na-ekanamichnyya i pravavyya dasledavanni* [Socio-economic and legal studies], 2009, no. 4, pp. 75–86 (In Belarusian).

4. Min'ko N. S. Constitutional and legal regulation in the sphere of nature management in the BSSR and the Republic of Belarus. *Belaruski gistarychny chasopis* [Belarusian historical journal], 2009, no. 12, pp. 36–39 (In Belarusian).

5. Bobylev A. I., Balashenko S. A. *Voprosy obshchey teorii ekologicheskogo prava* [Questions of the general theory of environmental law]. Minsk, BGU Publ., 1991. 123 p.

6. Bobylev A. I., Demichev D. M., Shingel' N. A. *Pravovoy rezhim ispol'zovaniya i okhrany prirodnykh ob'ektov i prirodnykh resursov: ekologicheskoe pravo: osobennaya chast': ucheb. posobie* [Legal regime for the use and protection of natural objects and natural resources: Ecological law: Special part]. Minsk, BGU Publ., 1992. 198 p.

7. Kochanovskiy, S. B. Environmental protection and environmental safety in the conditions of transition of the republic to a market economy. *Ekologo-ekonomicheskie problemy v Belorussii i puti ikh resheniya: sbornik nauchnykh trudov* [Ecological and economic problems in Belarus and ways to solve them: a collection of scientific papers]. Minsk, NIEI Gosekonomplana BSSR Publ., 1991, pp. 5–12 (In Russian).

8. Shimova O. S. Some aspects of improving the economic mechanism of environmental management in the conditions of transition to the market. *Ekologo-ekonomicheskie problemy v Belorussii i puti ikh*

*resheniya: sbornik nauchnykh trudov* [Ecological and economic problems in Belarus and ways to solve them: a collection of scientific papers]. Minsk, NIEI Gosekonomplana BSSR Publ., 1991, pp. 12–20 (In Russian).

9. Bartosh P. N. Some problems of restructuring the state environmental management in the republic. *Ekologo-ekonomicheskie problemy v Belorussii i puti ikh resheniya: sbornik nauchnykh trudov* [Ecological and economic problems in Belarus and ways to solve them: a collection of scientific papers]. Minsk, NIEI Gosekonomplana BSSR Publ., 1991, pp. 103 (In Russian).

10. Potekhina O. Ya. *Ekonomicheskie protivorechiya prirodopol'zovaniya: avtoref. dis. ... kand. ekon. nauk* [Economic contradictions of nature management: Abstract of thesis PhD (Economic Science)]. Minsk, 1993. 19 p.

11. Valentey S. D. *Sovershenstvovanie regional'noy sistemy ratsional'nogo prirodopol'zovaniya i okhrany okruzhayushchey sredy* [Improvement of the regional system of rational use of natural resources and environmental protection]. Minsk, BelNIINTI Publ., 1986. 92 p.

12. Parfenov V. I., Luchkov A. I. *Sovremennye podkhody k resheniyu ekologicheskikh problem v Belorussii* [Modern approaches to solving environmental problems in Belarus]. Minsk, BelNIINTI Publ., 1991. 47 p.

13. Masharova L. P., Botvinyeva A. M., Konstantinovich S. A. *Okhrana okruzhayushchey sredy i prirodopol'zovanie* [Environmental protection and nature management]. Minsk, RM IPK Publ., 1989. 57 p.

14. Avramenko N. M. *Melioratsiya Belorusskogo Poles'ya* [Melioration of the Belarusian Polesie]. Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2017. 165 p.

15. Peterson D. J. Troubled lands: the legacy of Soviet environmental destruction. Boulder, San Francisco, Oxford, Westview Press, 1993. 276 p.

### Інфармацыя пра аўтара

**Завацкі Яўген Ігаравіч** – магістр гістарычных навук, аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 6, Рэспубліка Беларусь). E-mail: zawadzki1996jauhien@mail.ru

### Information about the author

**Zavatski Yauhen Iharavich** – Master of Historical Science, PhD student, the Department of Modern and Contemporary History of Belarus. Belarusian State University (6, Nezavisimosti Ave., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: zawadzki1996jauhien@mail.ru

*Паступіў 20.09.2021*